Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 МАЯ 2018 г. АЎТОРАК № 86 (28702)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ВЕЧНЫЯ СІМВАЛЫ ПЕРАМОГІ

**Дарагія суайчыннікі!**

Прыміце сардэчныя віншаванні з Днём Перамогі.

Гэта свята прасякнута моцнымі эмоцыямі і пачуццямі: горыччу страты мільёнаў бязвінных жыццяў, радасцю вызвалення ад фашысцкага прыгнёту, усведамленнем няўстойлівасці міру і адказнасці за яго.

Мы назаўсёды захаваем праўдзівую гісторыю той вайны. Перададзім будучым пакаленням разуменне таго, што адзінства, вера ў сябе і сапраўдная любоў да Радзімы — надзейная абарона ад любой пагрозы. Мужнасць, нязломнасць волі і патрыятызм народа-пераможцы навекі застануцца сімвалам нашай нацыянальнай самасвядомасці.

Нізкі паклон і ўдзячнасць ветэранам!

Ваш подзвіг будзе жыць у нашых сэрцах як вялікі дар — магчымасць свабодна працаваць на роднай зямлі, выхоўваць дзяцей і ўнукаў на ідэалах дабра, сумленнасці і справядлівасці.

Ад усёй душы жадаю вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, шчасця і невычэрпнай энергіі на доўгія мірныя гады.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Ніколі любымі шляхамі ні ўрад, ні тым больш Прэзідэнт не ставіў такой задачы — дырэктыўнае павелічэнне зарплаты ў 1000 рублёў. Дадаткова атрыманыя прадпрыемствам сродкі павінны ісці не толькі на зарплату, але і на скарачэнне знешніх даўгоў. Прадукцыйнасць працы на прадпрыемствах павінна апярэджваць заработную плату. Тады атрымаецца добры баланс. Тады толькі будзе расці заработная плата».*

ISSN 1990 - 763X

# 92-і ДАВЫДАЎ МАЙ



**У Перароўскім сельскім Савеце Жыткавіцкага раёна застаўся толькі адзін ветэран Вялікай Айчыннай вайны — жыхар вёскі Хлупін Давыд Данілавіч ЯРМОЛЕНКА, якому ў сёлетнім маі пайшоў ужо дзевяноста другі год. Мне ўдалося застаць яго дома. Праведаць ветэрана якраз зайшла сацыяльны работнік Іна ШВЕЦ *(на фота)*. Шэсць гадоў жанчына апякуе ветэрана, дапамагае яму.**

**— На фронт я пайшоў у сямнаццаць, — прыгадвае Давыд Данілавіч. — На пачатку ліпеня сорак чацвёртага быў вызвалены Тураў, і тады мне ўручылі павестку...**

**Прызыў, у які патрапіў Ярмоленка, быў самы малады і апошні. Амаль усіх прызыўнікоў перад адпраўкай на перадавую вучылі ў армейскіх школах. Праўда, сваю вайну з акупантамі Давыд пачаў яшчэ раней, калі разам з бацькам і аднавяскоўцамі дапамагаў партызанам: на конях вазіў у лясныя атрады прадукты. Народныя мсціўцы тады дыслацыраваліся ў зоне ракі Прыпяці.**

**Пасля пераможнага сорак пятага сяржанту Ярмоленку давялося есці армейскую кашу яшчэ цэлых сем гадоў.**

**У мірным жыцці ветэран да выхаду на пенсію працаваў загадчыкам найлепшай у калгасе Хлупінскай жывёлагадоўчай фермы.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Мы памятаем!

## «МУЗЕЙ-БУС» АДПРАВІЦЦА ПА МАЛЫХ ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ

**7 мая каля стэлы «Мінск — горад-герой» Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў далі старт рэспубліканскаму патрыятычнаму праекту «Музей-бус «Кветкі Вялікай Перамогі».**

Традыцыйны праект маладзёжнай, прафсаюзнай і ветэранскай арганізацый рэалізуецца ў рамках трохбаковага пагаднення аб супрацоўніцтве і скіраваны на кансалідацыю намаганняў у справе выхавання ў моладзі нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасці; захаванне пераемнасці пакаленняў, гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне.

СТАР. 4




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Музей-бус» прыпаркаваўся каля стэлы «Мінск — горад-герой».

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»

«Урочышча Пяскі»

## ГОРА, ЯКОЕ ЯДНАЕ

### Як прадстаўнікі розных рэлігій дапамагаюць у будаўніцтве мемарыяла

**Ці можам мы быць спакойныя, пакуль нашы дзяды і прадзеды, якія абаранялі ў Вялікую Айчынную беларускую зямлю, дагэтуль належным чынам не пахаваныя? Адным з такіх месцаў памяці з'яўляецца «Урочышча Пяскі», што на ўскраіне Полацка. Газета «Звязда» з 2013 года інфармацыйна суправаджае ідэю стварэння мемарыяла на тэрыторыі гэтага масавага пахавання савецкіх воінаў, вязняў фашысцкага перасыльнага лагера «ДУЛАГ-125», мірных жыхароў. У полацкіх пясках засталіся астанкі, па розных звестках, ад 40 да 150 тысяч чалавек, якія дагэтуль належным чынам не пахаваныя. Да гэтага часу штогод вецер і дажджы агольваюць людскія косткі... Шмат сіл і сродкаў усёй краіны было аддадзена для таго, каб давесці будаўніцтва да ладу. Але з-за інфляцыі і несумленных падрадчыкаў узвядзенне так і не скончана.**

І ўсё ж такі за апошнія гады было зроблена нямала. Ужо з 2016 года стаіць капліца. Узведзена Сцяна памяці з прозвішчамі тых загінулых, якіх пашчасціла ідэнтыфікаваць, а таксама сімваламі розных канфесій і рэлігій — праваслаўя, каталіцызму, іўдаізму, ісламу, бо сярод пахаваных ёсць прадстаўнікі кожнай з іх. Наперадзе — будаўніцтва ўваходнага партала ў выглядзе крыжа, абеліска загінулым воінам, а таксама ўзвядзенне агароджы па перыметры мемарыяла. Ужо была пакладзена плітка на месцах пахавання, каб іх болей не размывала, але матэрыял, з якога яна выраблена, аказаўся няякасны. Пра гэты выпадак напрыканцы мінулага года пісала газета «СБ — Беларусь сегодня».

СТАР. 4